# ЗМЕСТ

**АНДРЭЙ ДАРОЖКІН.** Русая ноч, сівы ранак. *Апавяданне* . 4
**АНДРЭЙ КІМБАР.** Нічога не вернеш. *Вершы* . . . . . . . . . . . . . . 12
**ВІКТОРЫЯ ПІЛІПЕНКА.** На ладан дыхаць. *Апавяданне* . . . . 14
**Знайсці сваё сонца. Вершаваная падборка** . . . . . . . . . . . . 21
**АЛЕСЬ ДВАРАКОЎ.** Ці тая я. *Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
**МАРЫНА НЕЎГЕНЬ.** Ніякіх залішніх слоў... *Вершы* . . . . . . . . 38
**ВОЛЬГА АЛЯКСЕЕВА.** Вечнае жыццё. *Апавяданне* . . . . . . . . 42
**МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ.** Ваўкалакі. *Неагатычны раман. Працяг* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
**НАСТУСЯ ШЫПШЫНА.** Я сябе шукаю... *Вершы* . . . . . . . . . . 75

**ПЕРАКЛАДЫ**

**ГУСТАВА АДОЛЬФА БЭКЕР.** Рыфмы і легенды . . . . . . . . . . 76
**ЧАРЛЗ ДЗІКЕНС.** Аповед беднага сваяка . . . . . . . . . . . . . . . . 79

**СЛО/АВА ЯК НАГОДА**

**СЛАВА ГРЫНЕВІЧ.** Паэзія «Маладосці» — 2025: асобныя галасы і супольны спеў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85

**AUTOFICTION**

**НАТАЛЛЯ ІГНАЦЕНКА.** Задача з зорачкай, або Як знайсці настаўніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
**ВІКТАР ШЫМОЛІН.** Сон у месяцовую ноч на журфаку . . . 94

**МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ**

**МІКОЛА ТРУС.** Эпісталярны канвалют Язэпа Драздовіча . 96

**ІНТЭРВ'Ю**

**ЯНА ПСАЙЛА:** «Мару пра пашырэнне беларускай прасторы на Мальце...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104

**ЛІТАРАТУРНЫ СВЕТ**

**ЯЎГЕНІЯ ЛЯЗО.** Паразумецца з Цмокам . . . . . . . . . . . . . . . . 108



# АНДРЭЙ ДАРОЖКІН

## Русая ноч, сівы ранак

Апавяданне

***Дарожкін Андрэй нарадзіўся 2 ліпеня 1991 года ў вёсцы Гарбавічы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, працягваў навучанне ў магістратуры і аспірантуры. Піша вершы і прозу. Друкаваўся ў раённых газетах «Іскра» і «Зара над Друццю», а таксама ў «Настаўніцкай газеце» і штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Нёман» і «Маладосць». Лаўрэат шэрага рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў. Жыве ў Гродне, працуе бібліятэкарам.***

Макс заўважыў яе здалёк. Стройная жанчына, чые русыя валасы ў некаторых месцах ужо кранула сівізна, павольна праходжвалася паміж радамі сядзенняў, заклаўшы рукі за спіну. Адпіўшы праз трубачку таматнага соку, хлопец адзначыў для сябе, што яна падоўгу ўзіралася ў твары такіх розных людзей: якія толькі прыбылі ў сталіцу і якія чакалі адпраўлення ў іншыя гарады, якія сустракалі сваякоў і якія праводзілі каханых.

Часам жанчына спынялася побач з кім-небудзь надоўга — гэта магло б здацца не толькі няветлівым, але нават крыху напалохаць. Калі б не адна акалічнасць: яе прагулка нагадвала хутчэй адасобленую экскурсію па мастацкім музеі, чым бавенне часу ў сценах чыгуначнага вакзала.

— Яна глядзіць на кожнага, нібы на шэдэўр! — разважаў шэптам Макс, усвядоміўшы, што і сам ужо добрых пятнаццаць хвілін не зводзіць з жанчыны цікаўны погляд. — Вось дык дзіва: усміхаючыся, любуецца людзьмі — і многія ўсміхаюцца ёй у адказ!

З апошнімі словамі хлопец нечакана для самога сябе чхнуў. *«Значыць, праўду кажу»,*— пранеслася думка ў галаве да таго, як зразумеў, наколькі гучным выдалася пацверджанне правасці.

Цяпер і яна ўбачыла Макса. Паправіўшы каўнер шэрага дутага паліто адной рукой, незнаёмка некалькі секунд заставалася нерухомай, нібы абдумвала сваё рашэнне. Яшчэ праз імгненне яна накіравалася да Макса: упэўнена, але ўсё гэтак жа павольна. Хлопец агледзеўся па баках. Акрамя таго століка, за якім ён размясціўся, у адкрытай прасторы вакзальнага кафэ хапала вольных месцаў. Аднак паступова сумнеў змяніўся ўпэўненасцю: незнаёмка ідзе менавіта да яго.

Дзіўная справа, з кожным пройдзеным метрам яна нібы «скідала» гады — і вось: прыгожая жанчына апынулася маладой дзяўчынай. Магчыма, Макса, які стаміўся пасля доўгай дарогі, зрок падводзіў непасрэдна цяпер. А магчыма, ён падвёў хлопца першапачаткова, калі той прыняў пафарбаваныя ў попельна-белы колер пасмачкі за сівыя валасы.

Пачак ад таматнага соку — туды; «хвосцік» сасіскі ў цесце, які схаваўся ў цэлафанавым пакеце,— сюды; талерку з недаедзенай бульбай

фры — вось сюды… Хлопец прывёў у парадак столік, але так і не здолеў прывесці ў парадак уласныя думкі: *«Колькі ж ёй? Трыццаць пяць? Трыццаць? Дваццаць пяць? Чаму ж мне так няёмка? Можа, сарвацца — і знікнуць у невядомым ёй напрамку? Момант для ганебных уцёкаў яшчэ не страчаны!»*

— Вы дазволіце далучыцца? — вярнуў яго да рэальнасці мяккі голас.

Макс здзівіўся такой пастаноўцы пытання і разгублена паглядзеў на рэшткі няхітрай вячэры. Дзяўчына, зусім не саромеючыся, звонка засмяялася і паспяшалася ўдакладніць:

— Не, што вы! У мяне ўсё з сабой.

Як высветлілася, у складзеных за спінай руках яна ўвесь гэты час трымала папяровы пакет з лагатыпам «ДорОрс». Такі ж красаваўся над кафэ, дзе паўгадзінай раней зрабіў свой заказ Макс. Вочы хлопца акругліліся ад здзіўлення, калі дзяўчына дастала змесціва: маленькую ўпакоўку таматнага соку (з трубачкай на баку!), сасіску ў цесце і порцыю бульбы фры.

— Нічога сабе супадзенне…— выдыхнуў хлопец, упершыню паглядзеўшы незнаёмцы прама ў вочы.

*«Напэўна,— падумаў ён,— менавіта ў такіх, блакітных і бяздонных, баяцца патануць няўдалыя рамантыкі...»*

Дзяўчына не пачула думак хлопца, як і не заўважыла ні яго зацікаўленага позірку, ні падціснутыя ад хвалявання вусны.

Яна задуменна перасоўвала ежу па матавай паверхні століка, пакуль не размясціла кожную пазіцыю са свайго меню сіметрычна расстаноўцы, праведзенай Максам.

— Нічога дзіўнага…— адказала дзяўчына, паціснуўшы плячыма.— На вакзалах заўсёды хочацца чагосьці гэткага... З прысмакам падарожжаў, прыгод і выпадковых сустрэч!

— Гарачая сустрэча смачнейшая... Гарачая бульба! — паспяшаўся выправіцца Макс, у думках дакараючы сябе за крывы і недарэчны каламбур.

— Адносна бульбы маеце рацыю… Цалкам астыла,— пацвердзіла дзяўчына, дакрануўшыся пальцам да адной з бульбяных палачак.

— Я магу папрасіць, каб вашыя вытанчаныя стравы разагрэлі! — прапанаваў Макс з раптоўным прылівам натхнёнай шчырасці.

— Гэта будзе выдатна! Наконт знаёмства, дарэчы, вы таксама маеце рацыю… Давайце і яго падагрэем? — заправіўшы за вуха пасмачку валасоў, прапанавала суразмоўніца Макса і растлумачыла: — Будзе не менш выдатна, калі мы пяройдзем на «ты». Тое прымальна?

— Прымальна! Калі не браць пад увагу, што мы да гэтага часу не ведаем імёнаў адно аднаго,— пагадзіўся хлопец.

Ён падбіраўся ўказальным і сярэднім пальцамі, нібы маленькімі ножкамі, да сасіскі ў цесце і бульбы. Аднак яго перамяшчэнне прыпынілася шлагбаумам рукі, працягнутай для прывітання.

— Альбіна!

— Максім! Можна проста Макс!

Лёгка паціснуўшы далікатную цёплую далонь, хлопец усміхнуўся. Прыемнае маўчанне магло б зацягнуцца надоўга, калі б ён не нагадаў кіўком аб іх галоўнай мэце на бліжэйшыя некалькі хвілін.

Узяўшы ежу і імкнучыся не горбіцца пры хадзе, Макс накіраваўся да супрацоўніка кафэ, які стаяў у самотнай адзіноце. Так намеціліся, мабыць, найважнейшыя перамовы сённяшняга вечара.

*«Што за джэнтльмен! Падумаць толькі! — з’едліва загучаў унутраны голас.— Усяго хвіліна ўвагі ад прыгожай дзяўчыны — і паплыў. Імя якое! Рэдкае... Многіх Альбін ты ведаў да гэтага? Цяпер — оп: ні новай знаёмай, ні багажу, ні інструмента!»*

Так, прайшоўшы некалькі крокаў, ён рэзка павярнуўся — і ўбачыў: на патрапаны заплечнік дзяўчына ўсё ж не пакваплілася. Не пакваплілася яна і на гітару Макса… Хоць чахол, які надзейна захоўваў яго шасціструнную ўлюбёнку, відавочна выклікаў у Альбіны непадробную цікавасць. Яна акуратна праводзіла рукой па яго тканкавай паверхні, калі адчула: на яе глядзяць. Падняўшы галаву, дзяўчына шырока ўсміхнулася і ўскінула ўверх вялікія пальцы, паказваючы «клас!». Максу здалося, што яна адначасова і ацаніла чахол, і падбадзёрыла яго.

* * *

Ежу пагадзіліся разагрэць без лішніх пытанняў. Разам з ёй ад прыліву лёгкага сораму разагрэўся і Макс.

— Не сумавала? — спытаў ён, вярнуўшыся да століка.

— Не... Можа, зусім крышку... па ежы. Я вельмі прагаладалася!



# АНДРЭЙ КІМБАР

## Нічога не вернеш

Вершы

***Кімбар Андрэй нарадзіўся 26 верасня 1993 года ў гарадскім пасёлку Варапаева Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аспірантуру. Выкладае ў Мінскім гарадскім педагагічным каледжы. Вершы друкаваліся ў часопісах «Полымя» і «Маладосць». Аўтар зборніка вершаў «У кроку ад новай вясны».***

### Аўтабіяграфія

Крыху пра сябе:

кахаў,
ненавідзеў,
у смутку.
Астатняе —
дробязі.

Забыўся!

Не бачыў світанак
гадоў гэтак з дзесяць,
не чуў жаўрукоў, падаецца,
з пятнаццаць.

Яшчэ?

Жыццяпіс спрабаваў натаваці —
выходзілі вершыкі,
байкі без сэнсу
ды п'есы няўцямныя.

Планы?

Ад заўтра без планаў.
[Хаця спакушальна было напісаць
пра знаходжанне дзэну
ці нечага іншага].

Бракуе канкрэтыкі?

Запыт дашліце Харону,
Анубісу ці Гаўрыілу.
Ці хто там архівы жыцця
сцеражэ.

✦ ✦ ✦

Мы слухалі вершы,
мы верылі людзям,
мы мелі з чаго пасмяяцца.

Штось значыла гэта?
Напэўнае, так.
Ці варта прыгадваць?
Напэўнае, не.

Ды толькі штоночы
пад зорамі зноў паўстае



# ВІКТОРЫЯ ПІЛІПЕНКА

## На ладан дыхаць

Апавяданне

***Піліпенка Вікторыя нарадзілася 25 лютага 2001 года ў Мінску. Скончыла Літаратурны Інстытут імя А. М. Горкага па напрамку паэзіі. Зараз навучаецца ў аспірантуры, працуе над дысертацыяй аб авангарднай беларускай паэзіі. Піша вершы і прозу. Вершы публікаваліся пад псеўданімам Даня Молчит у расійскіх часопісах «Новый мир» і «Москва» ў 2023 годзе. Жыве на два гарады — Масква і Мінск, працуе капірайтарам і літаратурным рэдактарам.***

Я так баялася спазніцца на свой першы вочны аспіранцкі сход, што паехала на таксі замест тралейбуса — нават нягледзячы на метку пра высокі попыт. А цяпер, праз паўгадзіны, высветлілася: можна было і не спяшацца, бо сход ніяк не пачынаўся. Не маглі вызначыць колькасць удзельнікаў.

*Спех — курам на смех.*

«Спех» — дзіўнае слова, у жывой гаворцы яго амаль і не чула. Але і крыху роднае — бо падобнае да майго прозвішча. Аднойчы — вялікая падзяка аўтавыпраўленню! — я ліст на кафедру так і падпісала: «З павагай, Ліза Спех» замест «Ліза Шпехт». Наўрад ці, канешне, яны заўважылі. Я не ўпэўнена, што мае лісты там хтосьці ўвогуле чытаў.

Завочнікам надаецца менш увагі, гэта не сакрэт. Дый мне самой рабілася сумна ад нయведання, хто яшчэ з маёй кафедры пакутуе над дысертацыяй. Прыйшлося паскорыцца, вырашаючы свае справы з пераездам — затое першы экзамен на кандыдацкі мінімум буду трымаць ужо ў статусе аспіранткі вочнае формы навучання.

І з аднагрупнікамі — ці як там, аднакафедранікамі? — нарэшце пазнаёмлюся.

Як толькі разбяромся, колькі іх у мяне.

— Ну добра, давайце яшчэ раз па спісе,— ледзь стрымліваючы раздражненне, прапанаваў загкафедрай беларускага мовазнаўства. Як яго завуць — я не памятала, хоць ты трэсні, нягледзячы на вялікую колькасць адасланых лістоў за апошні год асабіста на яго імя.— Аляксееў тут?

*Ад аза да іжыцы,* так бы мовіць. Згадзіцеся, гучыць больш цікава, чым звыклае «ад а да я». На жаль, ужо не выкарыстоўваецца.

— Тут,— адгукнуўся рослы хлопец з першай парты.— Выбачайце, канешне, але мы ўжо чацвёрты раз па спісе ідзём.

Сапраўды, сход загадчык пачаў з пераклічкі і спытаў напрыканцы: «Усіх назваў?» Хоць мы і гуманітарыі, але ж бачым: імёнаў ён зачытаў шэсць, а нас у аўдыторыі нібы сямёра. Пачалі другую пераклічку. На гэты раз, здаецца, усе адгукнуліся, аднак нейкае прозвішча ён дакладна назваў двойчы. Ніхто не запомніў якое. І абодва разы адгукнуліся розныя людзі.

А яшчэ міргала святло. Не ведаю, што ў гэтым інстытуце з праводкай, але калі загка-

федрай плюнуў на спіс і ўзяўся лічыць нас па галовах, то хутка збіўся, бо лямпа з трэскам згасла, а калі праз некалькі секунд загарэлася зноў — руды хлопец, які сядзеў праз праход ад мяне, паведаміў: за маёй партай стала на аднаго чалавека менш.

Так і сказаў. А за маёй партай, на хвіліначку, сядзела толькі я.

Перад трэцяй пераклічкай (*Бог тройцу…* Ат, ладна, усё роўна ў яго не веру) падаў голас мужчына, які сядзеў ля акна. Ён быў старэйшы за нас усіх — я спачатку ўвогуле вырашыла, што гэта прыйшоў чыйсьці навуковы кіраўнік. Ён сказаў:

— А колькі нас увогуле павінна быць?

Загкафедрай прайшоўся алоўкам па спісе ў таўшчэзным журнале — лічыў радкі.

— Быццам бы шасцёра.

Святло міргнула.

— Халера, ці сямёра?

Я не паспела падумаць, што халеркаць у сценах інстытута, пэўна, забаронена статутам, як тут загкафедрай прайшоў да акна, адчыніў фортку і моўчкі засмаліў, усеўшыся на падаконнік. Ён напружана глядзеў кудысьці далёка, у глыбіню вуліцы, дзе ўжо зусім сцямнела.

— Я вось не магу зразумець,— у поўнай цішыні прамовіла коратка стрыжаная дзяўчына ў рваных джынсах і швэдары са значкамі.— Гляджу на вас — і нібыта ўсе на месцы, а нібыта кагосьці не хапае.

Я такіх вывадаў зрабіць не магла: усю гэтую кампанію бачыла ўпершыню. Хаця… Якраз дзяўчына ў швэдары падалася мне знаёмай: бачыла яе ці то ў рэкламе, ці то на нейкім плакаце. Вядомая, напэўна? Потым запытаюся.

— А мне здаецца наадварот,— азадачана адгукнуўся той загарэлы хлопец з першай парты, які праз хвіліну зробіць слушную заўвагу наконт пераклічкі ў чацвёрты раз.— Нібы твары ўсе знаёмыя, але ўсё роўна як быццам хтосьці лішні.

Тады я ўпершыню адчула, што мяне тут увогуле не павінна быць.

Лямпа загудзела і міргнула, загкафедрай атушыў цыгарэту проста аб падаконнік і вярнуўся за стол, дзе зноў схіліўся над журналам. І прапанаваў:

— Ну добра, давайце яшчэ раз па спісе.

У аўдыторыі цяпер пахла не толькі чымсьці лячэбна-шпітальным (кіславата, нібы кроплі ад гіпертаніі, — я адчула пах яшчэ на КПП, аднак тады не звярнула ўвагі), але і тытунём. Лямпа міргнула. Вось няўжо ж няма грошай на нармальнае асвятленне?!

Пасля Аляксеева — цяпер я ведала яго прозвішча — пераклічка спынілася. Пэўна, загкафедрай уразумеў, што рабіць адно і тое ж у надзеі на іншы вынік сэнсу не мае.

*Кіраваць-та ты кіруй, ды не вельмі тузай.* Дарэчы, гэта не народная мудрасць, як некаторым здаецца, а выраз з байкі Кандрата Крапівы. Напэўна, вы чыталі яе ў школе.

— Мо ўжо без спіса пачнём? — нясмела прапанавала дзяўчына, якая сядзела побач з Аляксеевым. Таксама рослая і таксама загарэлая, з такім жа светлым дрэнна намагляваным валоссем, з такім жа маленькім заплечнічкам на каленях.

*Як дзве кроплі вады.* Шкада, у аўдыторыі няма кулера: вельмі хочацца піць.

— Ды не можам мы пачаць! — з прыкрасцю ўсклікнуў загкафедрай. І ўзяўся тлумачыць нам, як неразумным дзецям: — Патрэбна спачатку запоўніць пратакол. А для гэтага — сфармаваць спіс прысутных. А як жа я тое зраблю, калі нават не магу зразумець, колькі вас, хале… Вось што,— ён перабіў сам сябе.— Усе падніміцеся, калі ласка, і пастройцеся па росце. Можа, хаця б так палічымся.

Я падумала, гэта жарт, але пабачыла: усе паслухмяна падымаюцца з месцаў і цягнуцца да стала загкафедрай. Я таксама паднялася — і нечакана пахіснулася: галава закружылася ці то ад духаты (на ацяпленні, у адрозненне ад лямп, тут не эканомілі), ці то ад таго, што надта хацелася спаць.

У ладным шэрагу аспірантаў я аказалася трэцяй злева, паміж мужчынам, які старэйшы за нас усіх, і худзенькай цёмнавалосай дзяўчынкай у вялізных акулярах, якая дагэтуль не сказала аніводнага слова. Загкафедрай пачаў пералічваць нас, звяраючыся са спісам, але як толькі скончыў — з розных бакоў данеслася: «Мяне прапусцілі!», «Навошта мяне тры разы палічылі?», «Ліза, я бачыла цябе ў навінах». Хаця апошняе, хутчэй за ўсё, мне падалося.

Загадчык уздыхнуў і сеў за стол, унурыўшыся ў журнал. Зняў акуляры, каб працерці.

Выраз «Як баран на новыя вароты» грунтуецца, калі можна так казаць, на рэальных

# ВАСІЛЬ ЛАЙКОЎ

*Нарадзіўся ў 2004 годзе ў Барысаве. Аўтар выставы графічных малюнкаў гарадскога пейзажу. Захапляецца музыкай і тэатрам, піша песні.*

## Мар-го

Мара гор...
Горы мараў...
Маг з рогам —
Рогам року...
Горная магма —
Маргарыта...
Гарыць мроямі,
Грае рытмамі!
Грэе палымянымі
Валасамі!
Жывымі жанглюе
Промнямі!
Жывою жанглюе
Музыкай...

Праходзіць скрозь полчышчы
Ворагаў,
Як гуляе на полі
Між кветачак.
Назірае ноччу
За зорамі...
Стварае —
Магічным пачуццём,
Любоўю нястрымнай —
Кашулі з нябесных
Палотнаў.
І дорыць іх
Людзям.

Вядзе Праметэяў
Скрозь цемру.
Грае жывых промняў
Рытмамі...
Марга-рыта,
Мара гор...
Горы мараў...
Марго
Маг
Ра
А
Не Рыта...

# АЛЕНА ПАБАТАЕВА

*Нарадзілася ў 2009 годзе ў Барысаве. Вучыцца ў 11 класе сярэдняй школы № 16. Захапляецца маляваннем.*

## Маўчу

А я маўчу, а я маўчу,
Хачу чагосьці, не хачу.
Зусім не ведаю, чаму
Маўчу я ўлетку і ўзіму.

Гляджу ў акно, сяджу ў кіно —
Маўчу, маўчу я ўсё адно.
Хтось ловіць зоркі... Я хачу,
Ды не лаўлю. Усё маўчу.

Алоўкі з татам я тачу,
Ён не маўчыць, а я маўчу...
Маўчанне — для душы ахова,
Яно зручнейшае за слова.

# АЛЯКСАНДРА СЯРГЕЕВА

*Нарадзілася ў 2008 годзе ў Барысаве. Студэнтка ветэрынарнага факультэта Ваўкавыскага дзяржаўнага аграрнага каледжа. Піша вершы і прозу. Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу «Юныя таленты Беларусі — 2023».*

✦ ✦ ✦

Цячэ са звычайнага
Іржавага крана,
Мой розум затапляючы
І жыццё разбаўляючы,
Туды-сюды па свеце шныраючы,
Усю пустэчу на зямлі запаўняючы,
Усіх маракоў благаслаўляючы,
Іх караблі на хвалях гайдаючы,
Звычайная іржавая вада.

✦ ✦ ✦

Табе вельмі пасуе
Быць сабой:
Такой мілай, далікатнай,
Жывой.
Але ж не трэба табе
Быць мной:
Часам маркотнай,
Часам злой.
Таму, калі ласка,
Ніколі
Не пазнавай мяне.

# ВЕРАНІКА ЛАЙКОВА

***Нарадзілася ў 2005 годзе ў Барысаве. Студэнтка факультэта дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Працуе кіраўніком майстэрні лялечнага тэатра ў Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Барысаўскага раёна. Паэт, лаўрэат літаратурнай прэміі імя М. Мятліцкага (2025), конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці «Зоркі Маладзечна» (2025).***

## Ода стыхіі

Добрыя дзеі,
Дзеі ліхія…
Ўсім валадарыць стыхія —

Людзямі ў думках,
Птахай ў прасторы
І нават суднам у моры.

Вольны ж стыхію
Слухаць не стане —
Ён сам стыхіяй паўстане!

✦ ✦ ✦

З акадэмічных змрочных сцен,
Дзе гаспадарыць нораў павучыны,
Дзе павучынай мудрасці вучылі —
Як аплясці, забіць ды з'есці дзень,—
Ляці, свабодны матылёк,
Туды, дзе мудрасці жывой крыніца,
Дзе вечна лозам па калонах віцца,
Дзе пух анёльскі пенай мора лёг,

Каб на свабодзе празвінеў
Твой арфакрылы спеў!

# ПАЛІНА ШКРАБКО

***Нарадзілася ў 2002 годзе ў Барысаве. Скончыла Расійскі дзяржаўны сацыяльны ўніверсітэт. Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу даследчых работ па біяграфіі і творчасці А. С. Пушкіна, дыпламант іншых літаратурных конкурсаў.***

## Крумкач

На пакаранне ідуць сляпыя так,
Быццам лёс іх ад іх асобна.
Стаіць Крумкач. На ім барвовы фрак,
На кагосьці ён дзіўна падобны.

Аскепак грыфеля і дзюбу пунсовую
Вастрыў ён аб чорнае-чорнае.
Зламанымі крыламі адначасова
Ён біў па белым слове — мінорнае.

Вышэй тонзура — косткі і пер'е
Ашчадна хапалі шалёныя чэрці.
Чакаў Крумкач свайго абуджэння,
Як ніколі не чакаў бы смерці.

І не чакаў бы тую,
Што наўмысна, без стука,
Завітвае ў мроі першай.
Прапаўзае па сценах, нібы гадзюка,
Абводзіць целам радкі яго акраверша.

Чарніла з вен і пяро з патыліцы
Выцягне без гучных слоў.
Марозная ўсмешка на твары крывіцца
І знікае ў свой апраметны схоў.

Быў гатовы караць усіх, хто смяяўся
У яго за плячыма і ціха шаптаў.



# ВОЛЬГА АЛЯКСЕЕВА

## Вечнае жыццё

Апавяданне

***Аляксеева Вольга нарадзілася 28 студзеня 1984 года ў горадзе Камянец Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Піша прозу. Апавяданні публікаваліся ў часопісах «Алеся» і «Любимая». Жыве ў Пружанах, працуе намеснікам дырэктара ДУК «Пружанская ЦБС».***

1

Цела як такога ўжо не існавала. Яно было знявечанае настолькі, што вырвала нават бывалых прыбіральшчыкаў. Яго часткі ў лужах крыві адразу кідаліся ў вочы.

«Не месца злачынства, а сапраўдная бойня,— падумала Эні, убачыўшы ўсё гэта.— Цудоўна!»

— Лейтэнант! — пазваў яе капітан Колд.— Ідзіце сюды!

Эні, усміхнуўшыся, паспяшалася да яго.

— Дзе вы ходзіце? — дакорліва ківаючы галавой, спытаў капітан, а потым, нахіліўшыся да яе і наблізіўшы свой твар амаль ушчыльную, прашаптаў:— Лепш прыбярыце з твару захапленне, вы палохаеце нашых хлопцаў. А то давядзецца нам тут усё падчышчаць самім.

— П-прабачце,— прамармытала яна.

Капітан хмыкнуў і пачаў разглядаць крывавае месіва на падлозе.

Эні, стрымліваючы пытанні, якія так і рваліся наверх, крадком назірала за ім. Капітан Колд быў выдатным лекарам. Адным з найлепшых у сваёй справе. Эні проста абагаўляла яго. Умольвала камітэт накіраваць працаваць з ім, аднак атрымала адмову. І толькі калі капітан усіх прэтэндэнтаў літаральна спусціў са сходаў, ёй далі шанц. І здарылася неверагоднае: ён пагадзіўся працаваць з дзяўчынай.

Задумаўшыся, Эні не заўважыла, што капітан ужо некалькі хвілін беспаспяхова кліча яе.

— Хопіць лятаць у аблоках! — не вытрымаўшы, крыкнуў ён.— У нас тут забойства майстра! Вазьміце сябе ў рукі і працуйце. Ясна?!

— Так, сэр,— вінавата кіўнула дзяўчына.

Колд, стараючыся супакоіцца, вельмі павольна выдыхнуў:

— Прабіце пакуль імя забітага. Час уваскрэсіць небараку.

— Зразумела.— Эні прыкрыла вочы і накіравалася да адраснага бюро — нічога. Рэгістрацыя — няма доступу.

— Не магу,— адкрыўшы вочы, узрушана прызналася яна.

— Не можаце? — здзівіўся капітан.— Добра, я сам.

Але, мяркуючы па лёгкім шоку на твары Колда, і яму не ўдалося прабіцца.

— Лейтэнант Нэйв, вып'ем кавы, пакуль хлопцы заканчваюць? — спытаў ён і, не чакаючы адказу, выйшаў.

## 2

За дзвярыма іх чакала ўтульнае кафэ ў французскім стылі. Цудоўны пах свежазваранай кавы бударажыў, вабіў і заклікаў.

Не паспелі лекары і кроку зрабіць, як перад імі паўстаў афіцыянт:

— Калі ласка, прадстаўцеся,— ветліва ўсміхаючыся, папрасіў ён, працягваючы ідэнтыфікацыйную панэль.

— Зразумела,— капітан Колд першым прыклаў да яе сваю далонь, і панэль запалілася чырвоным. Тая самая рэакцыя была і на лейтэнанта.

— Сардэчна запрашаем у кафэ «Angelina»,— перастаўшы ўсміхацца, даволі холадна павітаў іх афіцыянт, хаваючы панэль.— Чаго жадаеце?

— Два эспрэса. І ці ёсць вольны столік на тэрасе? — спытаў Колд. Эні запытальна паглядзела на свайго боса.

— Прабачце, але я магу прапанаваць толькі асобныя кабінкі. Вы і самі гэта ведаеце.

— Кабінка дык кабінка. Больш самотнасці. Так, лейтэнант? — чамусьці павесялеўшы, падміргнуў ёй капітан.

Афіцыянт фыркнуў. Эні разгубілася і зусім не ведала, як зараз іх апраўдаць. Яна ліхаманкава шукала словы, якія змаглі б вырataваць, але не знаходзіла.

— Каб падумаць,— нарэшце вымавіла лейтэнант першае, што прыйшло ў галаву. Колд выразна ўхмыльнуўся.

Афіцыянт спахмурнеў. Яшчэ раз зверыўся з ідэнтыфікацыйнай панэллю і вывучальна ўтаропіўся на іх.

— Дык вы праводзіце нас? — перапыніла гнятлівую цішыню лейтэнант Нэйв.

— Куды?

— Да нашай кабінкі,— Эні пастаралася ўкласці ва ўсмешку ўсё абаянне. Многія з прыбіральшчыкаў сцвярджалі, што яно ў яе зашкальвае.

Відаць, не хлусілі. Кіўнуўшы і злёгку ўсміхнуўшыся ў адказ, афіцыянт запрасіў іх ісці за ім.

Капітан Колд з адабрэннем паглядзеў на лейтэнанта.

## 3

— Эні, табе падабаецца тваё жыццё? — ашаламіў яе пытаннем капітан, як толькі яны засталіся адны.

— Ну, так,— задуменна працягнула лейтэнант.— Я займаюся любімай справай.

— І праўда, чаго яшчэ жадаць уваскрашальнай праграме? — працадзіў скрозь зубы Колд.— Ты жывеш так, як цябе запраграмавалі.

— Вядома, капітан,— спакойна адказала лейтэнант Нэйв, узмоцнена жэстыкулюючы, маўляў, і ў сцен ёсць вушы.

— Не турбуйся. Нас ніхто не чуе. У нас ёсць пару хвілін для праўды.

— Не ведаю,— на гэты раз сумленна адказала яна.— Я — праграма, якую напісаў хтосьці з майстроў.

— Ты — гэта ты, Эні,— нечакана падбадзёрліва сціснуў яе руку капітан Колд.— Захопленая, месцамі наіўная, смелая і самая лепшая дзяўчына, што я калі-небудзь сустракаў.

Лейтэнант на секунду анямела і сядзела літаральна з адвіслай сківіцай.

— А-а-а, я зразумела,— нарэшце ўключылася яна.— Вы мяне зараз правяраеце.

— Не, Эні,— запярэчыў Колд, сціснуўшы яе мацней.— Паслухай. Іншага шанцу можа не быць.

— Вы што?! — вырваўшы руку, шчыра абурылася лейтэнант Нэйв.— Хопіць! А то мне давядзецца…

— Дакласці на мяне? — усміхнуўся капітан.— Каму?

— Не змушайце мяне,— ці то пагражаючы, ці то ўмольваючы, прашаптала Эні.— Давайце проста забудземся пра гэтую размову і вернемся да працы.

Яна паспешна паднялася і накіравалася да выхаду, але наступныя словы Колда спынілі яе:

— Двое майстроў.

— Што?

— Забілі дваіх. І я ўжо ведаю, хто яны. Містар і місіс Ньюс.

Эні моўчкі села і паспрабавала пераварыць атрыманую інфармацыю.

Колд дэманстратыўна паглядзеў на гадзіннік, затым на дзяўчыну:

# МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ

# МІКОЛА ТРУС

## Эпісталярны канвалют Язэпа Драздовіча

Сярод старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі знаходзіцца фонд № 2 «Драздовіч Язэп Нарцызавіч». Архіўныя матэрыялы паступілі ў 1965 годзе; у 1974-м была завершана іх навукова-тэхнічная апрацоўка, складзены вопіс. Усяго ў названай калекцыі налічваецца 78 адзінак захоўвання; крайнія даты: 1798 г., 1840—1953 гг.

З вялікай колькасці разнастайных матэрыялаў гэтым разам нас зацікавіў своеасаблівы канвалют[1], у якім падшыта 11 карэспандэнцый (паштовак і паштовых картак), адрасаваных Язэпу Драздовічу (1888—1954), што рэпрэзентуюць у знакавых постацях і культурных праектах мінулага розныя гістарычныя этапы нацыянальнага жыцця:

- асветніцкую дзейнасць пачатку XX ст.;
- дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР 1920-х гг.;
- нацыянальны рух у Заходняй Беларусі 1920-х гг.

Гаворка ідзе пра перапіску, якая ажыццяўлялася ў розных краінах: Расійская імперыя, Савецкі Саюз, Польшча. Гэтым тлумачыцца выбар мовы, зафіксаванай на адрасным баку паштовак і паштовых картак.

[1] Канвалют (ад лац. convolutus — скручаны, сплецены) — зборнік асобных выданняў або рукапісаў, пераплеценых у адну кнігу.


Язэп Драздовіч. 1911 г.

Сярод аўтараў карэспандэнцый Іван Луцэвіч, Антон Лявіцкі, Дзмітрый Жылуновіч, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Аляксандр Шлюбскі. У гэтым пераліку пісьменнікі, вядомыя найперш пад сваімі псеўданімамі, падпісаліся пад лістамі сваімі сапраўднымі імёнамі, паколькі афіцыйна прадстаўлялі інстытуцыі, у якіх займалі адказныя пасады.

На вокладцы адмысловага альбома рукой Я. Драздовіча двойчы выведзена храналагічная паслядоўнасць ліставання: «1911—1915—1917—1927—1928—1929». Яна не зусім

дакладная, паколькі першая карэспандэнцыя датавана 28 кастрычніка 1910 г. Атрыбутаваць апошнюю праблематычна: дата не ўказана ў самім лісце, а марка разам з паштовым штэмпелем выразаны.

Праклеенасць пасланняў каля карэньчыка імправізаванага альбома ў шэрагу выпадкаў часткова закрыла адрасы Я. Драздовіча, што таксама ўскладняе атрыбуцыю архіўных матэрыялаў.




Паштовая картка Івана Луцэвіча (Янкі Купалы). Вільня, 4 ліпеня 1915 г.

## Зачыннае пасланне

Першая паштовая картка («Открытое письмо») выканана тыпаграфскім спосабам як фірмовая карэспандэнцыя беларускай газеты «Наша Ніва», пра што сведчыць друкаваны тэкст на адвароце з назвай і адрасам перыядычнага выдання («Вільня, Віленская вуліца. № 20»), прадубліраванымі кірылічнай і лацінічнай графікай.

У гэтай картцы з падшыўкі Я. Драздовіча імя адрасанта не ўказана, таму неабходна далейшая праца па яго ідэнтыфікацыі паводле почырку і зместу ліста.

Тут і далей мы публікуем тэксты паштовых картак і паштовак з указаннем адраса, захаваннем асноўных асаблівасцей напісання, паколькі адпаведная інфармацыя: 1) фіксуе месца побыту Я. Драздовіча, 2) фіксуе месца працы і пражывання адрасантаў, 3) з'яўляецца важнай першакрыніцай гісторыі станаўлення беларускага правапісу, 4) адлюстроўвае змену грамадска-палітычных рэалій, адлюстраваных не толькі ў адрасах розных краін, але і ў культуры ліставання, персанальнай камунікацыі.

Змяшчэнне выяў паштовак і паштовых картак дае магчымасць візуальнага знаёмства з першакрыніцамі.

*«г. Дисна,*
*Вилен. губ.*
*Заезжий дом Обезгаужы*
*Юзефу Дроздовичу*

*Скора выйдзе з друку беларускі каляндар на 1911 г. Ведаем з прыкладу леташняга году — як нарасхват куплялі ў вёсцы наш каляндар, але не было каму даставіць яго сялянам.*

*Вось, дзеля гэтага звяртаемся да Ш.<аноўнага> П.<ана> з просьбай — памагчы нам у распрадажы новага календара ў Вашай ваколіцы.*

*Высылаем каляндар толькі за грошы, або накладной платай.*

*Цэна календара 15 к., з перасылкай 20 к.*

*Калі выпішыцца адразу 10 календароў — за перасылку мы самі заплацім і дадзём у прыдатку 3 календары дарма.*

*З паважаннем*
*Кантора «Нашай Нівы»*
*28/X 10.*
*P. S. З адказам сваім не марудзьця»*[1].

## Янка Купала

Наступная паштовая картка напісана рукой Івана Луцэвіча (Янкі Купалы). Апрача таго, што адрасантам з'яўляецца класік беларускай літаратуры, карэспандэнцыя актуалізуе шэраг пытанняў адносна поўнай і дакладнай перадачы тэксту першакрыніцы, захаванасці ўсіх нюансаў эпісталярнага этыкету, выяўленага, найперш,

---

[1] Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі). — Ф. 2. Воп. 1. Адз. зах. 45. Арк. 2—2 адв.